УДК 61:615.1(062)(476-25)
ББК 52я73
А 43
ISBN 978-985-21-1258-1


***Мацкевіч Д.У.***

# УНІКАЛЬНЫ НАРОДНЫ АБРАД “КАЛЯДНЫЯ ЦАРЫ”

***Навуковы кіраўнік: выкл. Качан А.С.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г.Мінск*

Мэта: паведаміць гісторыю ўзнікнення свята «Калядныя цары» і паказаць абрад святкавання.

Народныя святы заўсёды былі важнай часткай жыцця нашых продкаў. Многія святочныя традыцыі засталіся ў мінулым, але некаторыя існуюць і зараз.

У 150 кіламетрах ад Мінска ў Капыльскім раёне знаходзіцца вёска Семежава, дзе з 13 на 14 студзеня праводзіцца ўнікальны народны абрад “Калядныя цары”, святкаванне якога бярэ карані ў XVIII стагоддзі. З гісторыі вядома, што пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, в. Семежава адышла да Расійскай імперыі. І пэўны час рускія салдаты знаходзіліся ў весцы. Згодна з паданнем, у дні святкавання Новага года па старым стылі яны хадзілі па хатах і паказвалі вясёлае прадстаўленне, за што іх гаспадары частавалі пірагамі. Калі салдаты пакінулі вёску, мясцовыя жыхары захавалі традыцыю.

Звычайна ў свяце прымаюць удзел каля 500 чалавек, якія пражываюць у вёсцы. Сем нежанатых маладых хлопцаў іграюць Цароў. Яны апранаюць белыя штаны і кашулі, чорныя боты і высокія шапкі-ківеры з рознакаляровымі стужкамі. Адзенне ўпрыгожваюць перавязаныя крыж-накрыж семежаўскія чырвоныя паясы з арнаментам. Дзеючымі асобамі свята таксама з’яўляюцца Урач, Дзед – пераапранутая жанчына, і Баба – пераапрануты мужчына. У першую чаргу Цары заходзяць ў хаты незамужніх дзяўчын, а потым – да астатніх. Паказваюць камічнае прадстаўленне сустрэчы і бітвы “цароў”, пасля чаго з’яўляецца “доктар” і “лечыць” сапернікаў, прапісваючы ім жартоўныя рэцэпты. У народзе лічаць, што ў той хаце, дзе пабывалі Цары, увесь год будзе багацце і мір. Свята заканчваецца вячэрнім шэсцем з факеламі.

З канца 1960-х гадоў абрад не праводзіўся, але ў 1996 годзе з дапамогай дакументальных матэрыялаў і ўспамінаў старажылаў яго адрадзілі. У 1997 годзе кампанія “Белвідэацэнтр” зняла дакументальны фільм пра “Калядных цароў”. У 2009 годзе абрад быў уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА, як аб’ект, які мае патрэбу ў тэрміновай ахове.

Нашы традыцыі – гэта наша багацце, тое, што адрознівае нас ад іншых народаў. Таму вельмі важна захоўваць іх. Калі будуць жыць беларуская мова, традыцыі і святы, будзе існаваць і беларускі народ.